ванне каштоўнасных арыенціраў беларускага грамадства ў накірунку асэнсавання значнасці традыцыйнага мастацтва ў сістэме сучаснай беларускай і сусветнай культуры, а таксама ахову і захаванне рэгіянальнай і лакальнай традыцыйнай спадчыны;

• з'яўляецца фестывалем асобага тыпу, які адзіны на Беларусі ва ўмовах постмадэрнісцкай культурнай парадыгмы (з яе ўхіламі ў псеўда- ці нават антыкультуру) паслядоўна скіраваны на адвечныя чалавечыя каштоўнасці, сканцэнтраваныя ў традыцыйнай культуры;

• звернуты да моладзі, абуджаючы ў ёй не толькі мастацкую крэатыўнасць, а і пачуцці нацыянальнай годнасці і гонару, як за сваю «малую радзіму», так і за адну з найсамабытных краін Усходняй Еўропы — Беларусь.

Фестываль «Берагіня» — гэта дынамічна развіваючыйся арганізм, які з кожным новым сваім крокам уключае ў свае імпрэзы ўсё новыя і новыя віды і формы матэрыяльнай і нематэрыяльнай традыцыйнай спадчыны беларусаў і прыцягвае да сябе ўсё больш моладзі. Можна сказаць, што фестываль з'яўляецца своеасаблівым рэкардсменам па колькасці і якасці далучэння да народнай творчасці дзяцей і моладзі Беларусі.

У цэлым, фестываль «Берагіня» як сукупнасць доўгатэрміновых, разнастайных, але сістэмна арганізаваных і ўнутрана шчыльна звязаных мерапрыемстваў — гэта магутны інструмент захавання каранёвых традыцый беларусаў як сімвалаў культуры, вакол якіх канцэнтруецца жыццесцвярджальная энергія этнасу. Без такой энергіі народ не здольны падаўжацца ў часе ні як этнічная адзінка, ні як дзяржава з доўгачасовай стабільнай перспектывай.

2006 г.

**Вячаслаў КАЛАЦЭЙ**,
*дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва*
*дацэнт БДУ культуры і мастацтваў,*
*кандыдат культуралогіі*

## «Берагіня» — сапраўдная з'ява «ад стагоддзяў» і «на стагоддзі»

Чэрвень 2008 г. ў асяродку знаўцаў і аматараў каранёвых форм беларускай культуры чакалі апошнія два гады. Менавіта два гады таму, у 2006 г., адбылася «Берагіня» папярэдняя, і наступны фэст, які традыцыйна збірае ўсё лепшае ў галіне пераймання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорнай спадчыны Беларусі, зацікаўленыя людзі бачылі як перыядычную, стабільную і запатрабаваную з'яву культурнага жыцця краіны. Магчыма, тут да месца будзе меркаванне нават пра буйную з'яву культурнага жыцця Усходняй Еўропы. Бо ўжо фестываль 2006 г. па наменклатуры гасцёў з суседніх краін de facto з'яўляўся міжнародным форумам, а па маштабу папярэдне праведзенай работы, якасці прэзентацыі розных рэгіёнаў Беларусі — мерапрыемствам сапраўды нацыянальнага ўзроўню.

Відавочна, што сваім амаль 10-гадовым шляхам праз час і прастору «Берагіня» ўжо зараз назаўсёды ўвайшла ў гісторыю як першы фестываль пераймання каранёвых форм руральнай культуры Беларусі. Дэталёвае асэнсаванне яе плёну як сацыякультурнага і адукацыйнага, выхаваўчага праекта яшчэ наперадзе Такое асэнсаванне, безумоўна, зробіць значны ўнёсак і ў айчынную тэорыю адукацыі і выхавання, і ў практыку дзейнасці ўстаноў сацыякультурнай сферы рэспублікі.

Праз эксклюзіўную справу, калісь распачатую на ўласную рызыку групоўкай навукоўцаў (Міколам Козенкам, Тамарай Варфаламеевай, Аленай Боганевай, Ірынай Мазюк) і неабыякавымі да лёсу сваёй зямлі кіраўнікамі (Іванам Паршутам, Святланай Беразоўскай, Інай Метліч), сёння ўся Беларусь атрымала набытак, каштоўнасць якога цяжка пераацаніць. Выпадак «Берагіні» адмысловы, бо акрамя прэцэдэнта праекта па этнакультурным выхаванні маштабу краіны мы маем «доўгаграючую», добра адладжаную і схільную да самаарганізацыі інфраструктуру фальклорнага руху ў рэгіёнах.

Нават пры самым павярхоўным аналізе гэты «эфект "Берагіні"» раскладаецца на тры кірункі. Па-першае, сфарміравана мадэль этнакультурнага выхавання сродкамі традыцыйнай культуры. Яна свядома сфакусаваная вакол паэтапна эксплікаваных жанраў фальклору (побытавы танец, гульня, песня, народны інструмент, народнае ДПМ), а «на выхадзе» яе — гарантаваныя этнаэкалагічныя паводзіны выхаванцаў, іх сацыялізацыя і інкультурацыя як грамадзян суверэннай унітарнай дзяржавы цэнтра Еўропы. Па-другое, з'явіўся рух дзіцячых і юнацкіх фальклорных калектываў з усіх рэгіёнаў Беларусі, якія транслююць у часе ўзоры мясцовай каранёвай традыцыі і тым самым гарантуюць існаванне беларусаў як народа — носьбіта адмысловай этнічнай культуры. Так, сапраўдным набыццём для сферы культуры Беларусі сталіся калектывы «Берагіня» з Мётчы, «Рудабельскія зорачкі»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і «Цярэшкавы шчодрыкі» з Рудабелкі, «Нежачкі» з Расонаў, «Верабейкі» з Любані, «Куманёк» з Міханавіч, «Верас» і «Гронка» з Мінску, якія «засвяціліся» і завяршылі ўласнае фарміраванне пад уплывам эстэтыкі, светапогляду носьбітаў аўтэнтычнай традыцыі падчас правядзення імпрэзаў некалькіх фестываляў. Па-трэцяе, праведзена каласальная даследчая праца, праца па дакументаванні і публікацыі сучасных помнікаў народнай творчасці ў выглядзе: серыі навуковых выданняў; матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый; дыпломных работ выпускнікоў, магістраў і аспірантаў ВНУ.

Усё гэта і шмат што іншае высока падымае прэсціж рудабельскага фэсту, вымагае шчырай павагі і ўдзячнасці да яго мужных і сумленных арганізатараў. Пры ўліку вынікаў амаль 10-гадовай гісторыі «Берагіні» падаецца неабходным, каб адказныя асобы з Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта разгледзілі пытанне па стварэнні дзяржаўнага стабілізацыйнага фонда па падтрымцы этнакультурнага выхавання ў краіне. Такі фонд змог бы вырашыць складанае пытанне фінансавання комплексных мерапрыемстваў, якія папярэднічаюць фестывальным, і ўласна фестывалю. Гэта — сапраўды актуальная патрэба, патрэба часу.

Імпрэзы «Берагіні» — шанец пераканацца яшчэ раз у тым, што пакуль буяе мастацтва народа, сам народ жывы і мае трывалыя перспектывы на шчаслівую будучыню. Мабыць, гэтую асаблівасць сапраўды адвечнага мастацтва, што абавязкова адгукнецца ў душы кожнага чалавека (які, вядома, толькі часова «госціць» ў гэтым свеце), меў на ўвазе Гётэ, сцвярджаючы: «Art longa, vita brevis» («Жыццё кароткае, мастацтва — адвечнае»). А мастацтва, да якога далучае «Берагіня», — сапраўды з'ява «ад стагоддзяў» і «на стагоддзі», таму чакаць сустрэчы з ім заўсёды прыемна, мроіста і хвалююча.

2008 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ